385 : 331
К-19
СПЕЦФОНДА
ГЛАВЛИТА БССР
СИГНАЛЬНЫЙ ЭКЗЕМПЛЯР

Ф. КАНСТАНЦІНАЎ

# ГЕРОЙ СОВЕЦКАГА САЮЗА

# ХВЯДОС СМАЛЯЧКОЎ



ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
„СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"
1 9 4 3

экземпляра цензурнему и на исправления отмечены

355,331
К-19
10205

Ф. КАНСТАНЦІНАЎ

# ГЕРОИ СОВЕЦКАГА САЮЗА
# ХВЯДОС АРЦЁМАВІЧ СМАЛЯЧКОЎ

★

Президентская библиотека
Республики Беларусь
8 800000 716350

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
«СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»
1943



## НАСТАЎНІК

Выступаючы на другім антыфашысцкім мітынгу моладзі ў Маскве, Герой Совецкага Саюза, снайпер-лейтэнант, студэнт Ленінградскага Горнага Інстытута Уладзімір Пчэлінцаў назваў імя Хвядоса Арцёмавіча Смалячкова. Увесь зал задрыжэў ад грому апладысментаў. Усім знаёмым, блізкім і родным было гэта слаўнае імя.

— Сапраўдным волатам,—гаварыў на мітынгу Уладзімір Пчэлінцаў,—быў Герой Совецкага Саюза Хвядос Смалячкоў — адзін з ініцыятараў руху знішчальнікаў. Ён знішчыў 125 гітлераўцаў.

Смалячкоў загінуў, але ён жыве ў подвігах сваіх таварышоў і вучняў.

— Х. А. Смалячкоў навучыў мяне снайперскаму майстэрству. Яму я абавязан тым, што на маім рахунку 40 знішчаных гітлераўцаў,— пісаў у Чырвонаармейскай газеце выхавальнік Смалячкова, снайпер Іван Зібраў.

Рахунак другога вучня Хвядоса Смалячкова, снайпера Рапаева, пераваліў ужо за 70 знішчаных фрыцаў. А старшы сержант, снайпер Сталяроў, таксама вучань Смалячкова, толькі за 5 выхадаў знішчыў 16 фашыстаў.

Вось наглядная табліца паспяховасці вучняў школы Хвядоса Смалячкова.

Дзесяць байцоў, навучаных Смалячковым снайперскаму майстэрству, маюць на сваім рахунку больш тысячы знішчаных гітлераўцаў.

— Біць фашыстаў па-смалячкоўску,—стала баявым лозунгам снайпераў Ленінградскага фронта, лік якіх пераваліў ужо далёка за тысячы, а колькасць знішчаных імі гітлераўцаў за 10 тысяч.

Так помсцяць гітлераўскім бандытам вучні і баявыя таварышы Хвядоса Смалячкова за смерць свайго настаўніка і друга.

Хто-ж ён герой-волат, настаўнік снайпераў-знішчальнікаў, выхавальнік цэлай школы бясстрашных воінаў?

## СЫН БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Хвядосу Смалячкову споўнілася толькі 18 год, калі ён стаў прызнаным настаўнікам і выхавальнікам цэлага атрада звышметкіх стралкоў, бясстрашных знішчальнікаў фашысцкіх двуногіх звяроў.

Федзя Смалячкоў нарадзіўся ў 1923 г. у вёсцы П. Магілеўскага раёна. Жыццё з дзя-

цінства не песціла яго. Сям'я вялікая, працаваць няма каму, дзяцей шмат, адзін пад адным, і самаму старэйшаму з іх—Федзю, толькі за першы дзесятак пераваліла.

Усяго чатыры класы змог скончыць Федзя, а далей прышлося пакінуць школу. Трэба было дапамагаць бацьку прахарчаваць сям'ю. Федзя стаў пастухом. Досвіткам, задоўга да ўсходу сонца, выганяў ён на пашу кароў, авечак і да позняга вечара хадзіў за імі па лясах. Ён палюбіў лес, зрадніўся з ім, усім сэрцам палюбіў родную краіну.

Работа з дзяцінства прывучыла Федзю да самастойнасці, рашучасці, кемлівасці. Ён рос трывалым, лоўкім, вынослівым.

Вялікая цяга была ў Федзі да вучобы. З кнігай ён не разлучаўся ніколі. Ішоў са статкам у поле і заўсёды ў торбачцы ў яго разам з кавалкам хлеба была і кніга. Кожную вольную хвіліну ён скарыстоўваў для чытання. Натрапілі каровы на свежую траўку, Федзя, наглядаючы за імі, разгортвае сваю любімую кнігу. Наступіў поўдзень, сонца грэе, жывёла ў цяньку на адпачынак укладаецца, Федзя, прылёгшы на траўку, захапляецца чытаннем. Так ён амаль усе кнігі з школьнай бібліятэкі перачытаў. Ён аднолькава захапляўся фантастычнымі раманамі Жуль Верна і цудоўнымі песнямі Янкі Купалы, гераічнымі подвігамі Спартака і вясёлымі байкамі Кандрата Крапівы. Федзя чытаў усё, што трапляла пад рукі

і ва ўсім знаходзіў прыгожасць, з усяго чэрпаў карысныя веды, накапліваючы іх для практычнага жыцця.

Федзя любіў пагутарыць з таварышамі, асабліва з больш дарослымі, пісьменнымі, падзяліцца з імі ўражаннямі аб прачытаных кнігах, паслухаць іх. З ім таксама любілі пагутарыць і аднагодкі, і дарослыя сяляне, для тых і другіх ён быў цікавым субяседнікам.

Захапляўся Федзя і гульнямі. Ён любіў гуляць у гарадкі, лапту, валейбол. І заўсёды, ва ўсіх спартыўных гульнях, Федзя, як правіла, выходзіў пераможцам. Спрытнасць, вынаходлівасць, вынослівасць заўсёды прыносілі яму перамогу ў спаборніцтвах.

Зімой Федзя многа і лоўка ездзіў на лыжах, летам праводзіў вольны час на рацэ.

Так праходзілі дні, месяцы, гады. Федзі споўнілася ўжо шаснаццаць год. Ён стаў адным з лепшых работнікаў у калгасе імя Чкалава, які арганізаваўся ў родным сяле.

Калгас стаў багатым, моцным. Калгаснікі атрымлівалі па працаднях удосталь збожжа, гародніны, у кожнага калгасніка была карова, авечкі, свінні. Пачалі забываць аб нястачах, беднасці. Дружныя песні і вясёлы смех чуліся з калгаснай вёскі.

Увосень 1940 года праходзіў набор у школы фабрычна-заводскага навучання і рамесленыя вучылішчы. Заўсёды квапны да ведаў, да ўсяго новага, цікавага Смалячкоў пакідае

родны калгас, хату, ў якой нарадзіўся і вырас, і з вясёлай шумнай гурбой беларускіх юнакоў едзе ў Ленінград, вучыцца ў школе фабрычна-заводскага навучання будаўнікоў.

## У ГОРАДЗЕ ЛЕНІНА

Ленінград ласкава прыняў пасланцоў беларускага народа.

Фабзайцам, як жартам называлі вучняў школ фабрычна-заводскага навучання, працоўныя Ленінграда падрыхтавалі прасторныя школы, добра абсталяваныя вучэбныя майстэрні, прыгожыя інтэрнаты. Толькі вучыся, набывай выбраную спецыяльнасць, накаплівай вопыт і веды.

Смалячкоў прагна накінуўся на кнігі, уважліва слухаў парады майстроў, пасцігаў тонкасці рамяства.

Ён выбраў сабе прафесію будаўніка. Праходзячы па вуліцах Ленінграда, ён захапляўся яго палацамі і школамі, жылымі дамамі і інстытутамі.

— Усё гэта зрабіў чалавек!—не раз паўтараў Федзя Смалячкоў.

У душы ён ганарыўся людзьмі, якія здольны будаваць гэтыя дамы, радаваўся, што і яму прадстаіць быць будаўніком гэтакіх цудоўных будынкаў, заводаў, гарадоў.

І ён стаў будаўніком ленінградскіх пала-

цаў. На Міжнародным праспекце з кожным днём усё вышэй і вышэй узнімаўся цудоўны палац для рабочых Ленінграда. Цэглу за цэглай спрытна ўкладваў у гэтыя сцены стахановец Хвядос Смалячкоў.

Федзя марыў ужо аб тым, як ён дабудуе гэты палац, як весела і шчасліва будуць жыць у ім ленінградцы, а ён, Смалячкоў будзе будаваць другі, трэці, чацверты такі-ж цудоўны палац.

Ён марыў і аб тым, як ён паступіць у будаўнічы тэхнікум, потым у інстытут, стане інжынерам, камандзірам вялікай арміі будаўнікоў.

Ён марыў аб тым часе, калі такія-ж цудоўныя палацы ён будзе будаваць і ў родным калгасе, у блізкім і дарагім Магілеве; калі ўся краіна пакрыецца светлымі, прасторнымі палацамі і цудоўнымі садамі.

Гэтыя мары не былі пустой фантазіяй юнака. Так думалі, гэтым жылі і за гэта змагаліся мільёны совецкіх людзей. І гэтыя мары збыліся-б поўнасцю, каб не падзеі, якія павярнулі ўсё жыццё ў іншым напрамку.

## «МАЁ МЕСЦА НА ФРОНЦЕ»

22 чэрвеня 1941 г. радыё разнесла трывожную вестку:

— Сёння, у 4 гадзіны раніцы, без прад'яўлення якіх-небудзь прэтэнзій да Совецкага

Саюза, без абвяшчэння вайны, германскія войскі напалі на нашу краіну, атакавалі нашы граніцы ў многіх месцах і бамбілі з сваіх самалётаў нашы гарады: Жытомір, Кіеў, Севастопаль, Каунас...

Хвядос Смалячкоў слухаў прамову Вячэслава Міхайлавіча Молатава і перад яго вачыма ўсплыла родная Беларусь, любімыя гарады і сёлы, палі і лясы, якія ўжо, быць можа, топча фашысцкі бот.

Дапамагчы роднай краіне абараняць ад смерці і гвалту нявінных совецкіх людзей— вось над чым думаў цяпер Хвядос Смалячкоў.

— Маё месца на фронце!—цвёрда рашыў ён і накіраваўся ў Райваенкамат.

— Хачу ў армію, на фронт, таварыш ваенком!

Ваенком паглядзеў на юнака, які стаяў перад ім, запытаў, колькі яму год, што робіць і спакойна адказаў:

— Малады, яшчэ паспееш!

Ніякія просьбы, довады з боку Смалячкова не дапамаглі, але ён не думаў заспакоіцца на гэтым.

Прайшло ўжо два тыдні вайны. Вораг рваўся наперад. Гітлераўскія орды таптАлі родныя палі Беларусі, падступалі да Ленінграда.

Ленінградцы браліся за зброю, непахіснай сцяной паўставалі на абарону любімага горада, горада славы і подвігаў.

І Смалячкоў зноў пайшоў, пайшоў у Вы-

баргскі райком комсамола з цвёрдым намерам на гэты раз ужо дабіцца свайго.

— Я снайпер, хачу ісці на фронт,—заявіў ён.

— Снайпер?—А колькі-ж табе год?

— Восемнаццаць ужо! — адказаў Смалячкоў, яўна робячы націск на «ужо».

— Трэба трохі падрасці...

Чырванню заліўся твар Смалячкова. Але вочы яго гарэлі ярка, рашуча. На гэты раз ён не збіраўся так лёгка адступіць. Усё гэта ён ужо чуў у ваенкамаце тады, у першы раз, але зараз ён не выйдзе з райкома, пакуль не даб'ецца свайго.

— Я і так падрос. Я ваяваць хачу,—рашуча заявіў Смалячкоў.

Было ясна, што гэты юнак пачынае справу для таго, каб яе скончыць, ставіць мэты для таго, каб іх дасягнуць.

У райкоме задаволілі просьбу Смалячкова. Ён быў залічан у часць народнага апалчэння ад праслаўленай Выбаргскай стараны, і хутка адправіўся на фронт.

## КАШАВАР

— Гэта злая іронія лёсу, насмешка, не інакшай,—думаў Смалячкоў, калі, прыбыўшы ў часць, атрымаў загад камандзіра працаваць на кухні.

— Няўжо я для таго скончыў школу снайпераў, каб чарпаком у кацёл трапляць,—хваляваўся Смалячкоў.—Маглі-ж яны каго-не-

будзь іншага кухарам назначыць, дык не, — абавязкова мяне!

Але хутка погляды Смалячкова на ролю кашавара на вайне крыху змяніліся. Аказалася, што зварыць смачны і сытны абед ва ўмовах франтавой абстаноўкі,—не такая простая рэч. Аднак Смалячкоў авалодаў і гэтай новай прафесіяй. Байцы былі задаволены сваім кашаварам. Ні працяглыя маршы, ні бамбёжка фашысцкіх сцярвятнікаў—нішто не магло перашкодзіць Смалячкову своечасова і сытна накарміць чырвонаармейцаў.

— Гатуе, як кухар з трыццацігадовым стажам,—весела жартавалі байцы.

А Смалячкоў, падбадзёраны ўвагай і ўдзячнасцю байцоў, назаўтра рыхтаваў абед яшчэ лепш, яшчэ смачней.

## САМАЕ МОЦНАЕ ЖАДАННЕ

Смалячкоў працаваў хутка, з захапленнем, здавалася, вось дзе чалавек знайшоў сябе, праявіў свае здольнасці. Але ў глыбіні душы ў яго наспеў іншы план, яго чакала іншая справа.

Знайшоўшы падыходзячы момант, Смалячкоў звярнуўся да камандзіра.

— На перадавую мне хочацца, таварыш камандзір. І страляць я нядрэнна магу.

Пад Ленінградам у гэты час ішлі напружаныя баі. Вораг, захлынаючыся ва ўласнай

крыві, праз горы сваіх трупаў рваўся наперад. Полк народнага апалчэння, у якім служыў Федзя Смалячкоў, паспяхова стрымліваў шалёны націск абнаглеўшых гітлераўскіх галаварэзаў і час-ад-часу пераходзіў у контратакі, наносячы жорсткія ўдары ворагу.

Камандзір палка, якраз у гэты час, калі да яго звярнуўся з просьбай Хвядос Смалячкоў, абдумваў план чарговага контрудару.

Камандзіру трэба было ўдакладніць сілы праціўніка на гэтым участку, разведаць размяшчэнне яго агнявых точак, кабісці ў атаку напэўна, з меншай рызыкай і мінімальнымі ахвярамі дасягнуць перамогі.

— Гаворыш, пастухом быў? — перапытаў камандзір, углядаючыся ў Смалячкова.

Перад ім стаяў невысокі, але добра складзены хлапец, рашучы, гатовы выканаць любыя заданні.

— Дык вось, Смалячкоў, мы з табой зноў пастухамі станем. Але трэба нам пасвіць гэтых жывёл, каб у шкоду не лезлі.

Вочы Хвядоса гарэлі агнём радасці, а багатая фантазія ўжо ляцела да родных беларускіх палёў і лясоў, да будучых подвігаў і прыгод.

## ВЫДАТНЫ РАЗВЕДЧЫК

— Ну, чым я не сапраўдны пастух? І лапці, і світка, і торба праз плячо, поўбуханкі хлеба

і доўгая пуга ў руцэ, — гаварыў Смалячкоў, аглядаючы сябе з усіх бакоў.

Ноччу Федзя рушыў у дарогу, у тыл ворага праз лінію фронта.

Там ён прышоў проста ў нямецкі штаб. Са слязамі на вачах расказаў Федзя, што калгаснікі ўгналі ўвесь статак, а яго, за тое, што не даваў жывёлу ўганяць і сам не хацеў ісці з імі, моцна збілі і прагналі. Вось ён і прыйшоў да немцаў скардзіцца.

Фашысты адабралі ў пастушка хлеб, распыталі ў яго аб усім і «угаварылі» стаць фашысцкім разведчыкам. Федзя доўга не згаджаўся, «баяўся» да большэвікоў ісці, але пасля багатых абяцанняў і не менш шчодрых пагроз згадзіўся схадзіць да большэвікоў і разведаць, што там робіцца.

— Я толькі дамоў, у суседнюю вёску зайду,—папрасіўся Смалячкоў і, атрымаўшы дазвол, вышаў з звярынага кодла.

«Па дарозе ў сваю вёску» Федзя абышоў усю лінію нямецкай абароны, разведаў, дзе размешчана артылерыя, мінамёты, танкі, дзе пабудаваны дзоты. І пад прыкрыццем ночы спакойна перайшоў лінію фронта і прыбыў у сваю часць.

У тую-ж ноч наша часць прадпрыняла рашучую атаку. Вораг, захоплены знянацку, быў нагалаву разбіты. Пакідаўшы зброю, боепрыпасы, многа раненых, гітлераўскія ваякі кіну-

ліся наўцёкі, як зайцы хаваючыся ў лесе і ў хмызняку.

Смалячкоў адным з першых уварваўся ў штаб; ён хацеў захапіць афіцэра, які спрабаваў зрабіць Смалячкова фашысцкім лазутчыкам і асабіста разлічыцца з гэтым гітлераўскім сабакам. Але ногі ў гітлераўскага ваякі аказаліся сапраўды вартымі лепшага ганчака. Так і не ўдалося яго дагнаць.

## ШКОЛА НЯНАВІСЦІ

Многа разоў пераходзіў Хвядос Смалячкоў лінію фронта. Не адзін раз ён забіраўся ў далёкі тыл праціўніка, здабываў каштоўныя весткі і ў час дастаўляў іх камандаванню часці. Не адзін раз часць, карыстаючыся здабытымі Смалячковым дакладнымі данымі аб праціўніку, паспяхова адбівала атакі гітлераўскіх войск і наносіла ім моцныя ўдары.

Аднойчы Федзя накіраваўся ў разведку ў адно з калісьці цудоўнейшых месц пад Ленінградам—пасёлак Пушкіна.

Смалячкоў і да таго бачыў нямала слядоў фашысцкіх зверстваў. Ён бачыў спаленыя дашчэнту вёскі, зруйнаваныя гарады, паранены Ленінград. Ён бачыў руіны дому на Міжнародным праспекце, які ён будаваў уласнымі рукамі, многа другіх разбураных фугаскамі і артылерыйскімі снарадамі дамоў. Бачыў ён нямала забітых—на фронце і ў тыле. Але тое, што

ўбачыў Смалячкоў тут, у Пушкіне, яго ўзрушыла да глыбіні душы, прымусіла інакш глядзець на ўсё акаляючае, на сваё жыццё. З гэтага часу ўвесь сэнс жыцця ён бачыў толькі ў адным: помсціць, помсціць і помсціць. Помсціць за зруйнаваныя гарады і сёлы, за знявалену родную Беларусь, за кроў і слёзы сваякоў, блізкіх, знаёмых, за пакуты ўсіх совецкіх дзяцей.

...Смалячкоў доўга стаяў ля брамы запусцелага двара і моўчкі глядзеў, як на перакладзіне брамы ціха гойдаліся трупы пяці павешаных юнакоў. Яны таксама, як Смалячкоў, як сотні іншых юнакоў нашай вялікай радзімы, марылі вучыцца, стаць інжынерамі, пісьменнікамі, лётчыкамі. У нашай краіне кожны з іх мог ажыццявіць свае мары. Але вось у гэтую краіну, як галодныя зверы, уварваліся орды гітлераўскіх забойцаў і грабежнікаў. Яны пазбавілі свабоды, шчасця і жыцця многія тысячы совецкіх людзей, абарвалі тысячы жыццяў, якія толькі што пачыналіся.

Яны павесілі і гэтых пяць юнакоў. За што? Толькі за тое, што ў іх былі комсамольскія білеты і яны не жадалі стаць пакорнымі рабамі фашысцкіх людаедаў. Тут-жа побач ля трупа яшчэ маладой жанчыны застыла акрываўленае груднос дзіця.

Вось, каля плоту, ляжыць з сівой барадой дзед. Далей—яшчэ і яшчэ трупы па-зверску

закатаваных совецкіх людзей, попелішчы, руіны.

— Гады, каты,—працадзіў скрозь зубы Смалячкоў, моцна сціскаючы ў руках халоднае дула аўтамата.

Тут, на пустынным двары пасёлка Пушкіна, Федзя даў клятву адпомсціць за смерць незнаёмых, але блізкіх і родных яму людзей.

## БАЯВЫ РАХУНАК ПАЧАЎСЯ

...У той вечар Смалячкоў быў асабліва задумлівы і маўчалівы. Ён сядзеў на нарах у зямлянцы і, здавалася, не заўважаў нічога і нікога навокал. Таварышы ведалі, што ў такія хвіліны лепш не перашкаджаць яму. Пакуль ён не прадумае пытання да канца, ён не стане гаварыць, а калі вырашыць, то сам усё раскажа.

Раніцай Смалячкоў накіраваўся да камандзіра часці.

— Таварыш камандзір,—звярнуўся Смалячкоў,—дазвольце мне схадзіць на паляванне на двуногага звера. Стралок я нядрэнны. Промаху не дам. Яшчэ ў вёсцы з драбавіка па ваўках страляў, а зараз з снайперскай па двуногіх ваўках пастраляць хочацца...

Камандзір задумаўся. Ён добра ведаў Смалячкова, ведаў, што яшчэ ў школе ФЗУ ён снайперскую справу вывучаў, ведаў яго кемлівасць, настойлівасць. Але снайпер павінен

валодаць жалезнай воляй, цярпеннем, выключнай вытрымкай. Камандзір сумляваўся, ці знойдзецца ўсё гэта ў зусім яшчэ юным байцы.

Камандзір узняў вочы на свайго субяседніка: перад ім стаяў падцягнуты, добра складзены юнак. У вачах яго струменілася непахісная рашучасць, якаясьці ўнутраная, вялікая сіла.

Камандзір быццам прачытаў усё гэта ў адкрытых вачах Смалячкова, па-прыяцельску паклаў яму руку на плячо і запрасіў сесці побач на лаву.

— Вось што, Смалячкоў,—загаварыў мякка, па-бацькоўску камандзір,—снайперская справа тонкая, моцную волю трэба мець, жалезную вытрымку. Ты першым у нашай часці ідзеш, глядзі ў абодвы... Адным словам, прабуй...

Смалячкоў старанна рыхтаваўся да першага выхаду. Ён загадзя выбраў месца, добра праверыў вінтоўку і досвіткам са сваім напарнікам Шушкіным накіраваўся на агнявы рубеж. Тут ён лоўка замаскіраваўся, залёг і як-бы прырос да зямлі. Цэлы дзень ён не спускаў вачэй, наглядаў за варожай пазіцыяй. Імжыў лёгкі асенні дожджык, якаясьці мёртвая цішыня панавала на цэлым участку фронта. Толькі здалёк чуўся гул артылерыйскай кананады, ды ледзь даносілася завыванне мін.

Пахмурны дзень пачаўся непрыкметна, але хутка пераходзіць у вячэрні змрок. Ні адзін

немец так і не паказаўся за ўвесь дзень на гарызонце. Крыўдна да слёз было вяртацца дадому.

«Засмяюць,—думаў Смалячкоў. — І што я камандзіру скажу? Не пусціць больш».

Але нічога падобнага не адбылося. Таварышы вельмі спачувальна аднесліся да першай няўдачы маладога паляўнічага і ўпэўнена абнадзеялі:

—Нічога, пападуцца яшчэ, не гаруй.

А камандзір, усміхаючыся, дадаў:

— Ну што-ж, як кажуць, першы блін заўсёды комам. Затое другі не падгарыць.

Смалячкову не спалася ўсю ноч. Задоўга да світання ён разбудзіў напарніка і разам з ім пайшоў на перадавую.

На ўсходзе займалася зара. Якраз такую зару любіў сустракаць Федзя ў роднай Беларусі, калі раніцай выганяў свой статак на пашу.

У перадранішняй імгле Федзя ўбачыў, як з бліндажа вышла група немцаў і накіравалася да акопаў. Сэрца часцей забілася ў грудзях у Смалячкова, а Шушкін ледзь не крыкнуў ад радасці... Адлегласць паміж Смалячковым і гітлераўцамі была не больш 250 метраў. Нічога не падазраючы, яны ва ўвесь рост ішлі на вачах у снайпера. Смалячкоў прыцэліўся і спакойна спусціў курок. Сухі стрэл адзіночна шчоўкнуў у ранішняй цішы і ўслед за ім пя-

рэдні гітлеравец, крыкнуўшы, грузна апусціўся на зямлю. Астатнія ўмомант схаваліся.

— Адна штука ёсць, падміргнуўшы, сказаў Смалячкоў.

— Ну, што-ж, для пачатку і гэта нядрэнна,—у тон яму адказаў Шушкін. А дзень наперадзе. Колькі яшчэ можна настраляць гэтай дзічыны...

Чакаць прышлося нядоўга. Цэлая група фашыстаў з'явілася неўзабаве амаль на тым-жа месцы. Прыціскаючыся да зямлі, яны пацягнуліся да забітага. Смалячкоў зноў спусціў курок. Яшчэ адзін фашыст ткнуўся носам у сырую зямлю. На дапамогу яму кінуўся другі, але і той, зрабіўшы два-тры крокі, як падкошаны, паваліўся на зямлю. Астатнія папаўзлі назад, так і не адважыўшыся наблізіцца да прыстрэленых фашысцкіх сабак.

Вячэрнім змрокам, стомленыя, але бадзёрыя і радасныя, вярталіся «паляўнічыя» да сябе ў зямлянку.

Неўзабаве ўся часць даведалася аб поспеху Смалячкова. Усё гаварылі аб ім. Прыклад Смалячкова аказаўся вельмі заразіцельным. Байцы прасіліся ў камандзіра пусціць іх на «паляванне».

Другі дзень у Смалячкова аказаўся яшчэ больш удалым. Адзінаццаць фрыцаў улажыў ён за адзін дзень.

Вечарам, калі скончыліся роспыты і байцы патроху сталі ўкладвацца спаць, Смалячкоў

падсеў да капцілкі і штосьці ўважліва выводзіў на аркушы паперы. Пасля ён падышоў да комсорга і падаў заяву аб прыёме ў комсамол.

«Прашу прыняць мяне ў комсамол, — пісаў ён у заяве. — З комсамольскім білетам буду яшчэ актыўней знішчаць фашыстаў».

— Даўно хацеў, ды ўсё сумняваўся: ну, чым я давяду, што я сапраўды комсамолец,— дадаў Смалячкоў. — А цяпер—справа іншая.

На комсамольскім сходзе Смалячкоў даў абавязацельства знішчыць 20 фашыстаў да 24 гадавіны Кастрычніка. Сваё слова Смалячкоў стрымаў. За шэсць дзён ён знішчыў 23 фашысцкіх бандытаў.

## ТАК ЗМАГАЮЦЦА КОМСАМОЛЬЦЫ

«Паляванне» за двуногім звяр'ём стала ваеннай спецыяльнасцю Смалячкова. Кожны дзень ён досвіткам выходзіў на пярэдні край абароны і толькі цёмнай ноччу вяртаўся ў зямлянку.

Слава аб бясстрашным знішчальніку фашыстаў разнеслася па ўсяму злучэнню, па ўсяму фронту. Даведаліся аб Смалячкове і па той бок фронта—у фашысцкім логаве. Немцы ў што-б там ні стала пастанавілі зжыць са свету майстра смертаноснага агню.

Кожная куля Смалячкова пападала ў мэту, знішчаючы гітлераўскіх бандытаў.

У Смалячкова з'явілася шмат паслядоўнікаў, вучняў. Па яго прыкладу разгарнуўся рух дзесятнікаў, г. зн. снайпераў, якія знішчылі не менш 10 гітлераўцаў. Пасля з'явіліся «дваццатнікі», «пяцідзесятнікі», і, урэшце, снайперы, якія знішчылі сотню, дзве, а пасля і больш нямецкіх акупантаў.

Кожны снайпер цяпер выходзіў на «паляванне не толькі з вінтоўкай, запасам патронаў і аптычнай прыладай, але і з блакнотам у кішэні, з дакладна разграфленай таблічкай. І пасля кожнага трапнага стрэлу снайпер дакладна выводзіў алоўкам палачку ў сваім блакноце. Так пачынаўся баявы рахунак. Да новага года на асабістым рахунку Хвядоса Смалячкова было ўжо 111 знішчаных фашыстаў.

2 студзеня 1942 г. Смалячкоў пісаў у чырвонаармейскай газеце «Наперад»:

«Цяпер я пачаў знішчаць другую сотню гітлераўскіх бандытаў. Я яшчэ настойлівей і самаадданей буду паляваць за двуногімі звярамі, буду выхоўваць сваім прыкладам кадры снайпераў. Знішчаючы фашысцкае звяр'ё, я помшчу за любімую радзіму, за родную Беларусь, зямлю, якую топчуць нямецка-фашысцкія боты.

Ні адна куля не пройдзе міма мэты! Я буду працягваць свой рахунак бесперапынна да поўнага знішчэння ворагаў нашай радзімы!».

За Смалячковым ішлі дзесяткі яго вучняў,

сотні і тысячы яго паслядоўнікаў. Кожны імкнуўся пабольш знішчыць фашысцкіх двуногіх звяроў, хутчэй вызваліць нашу радзіму ад гітлераўскага нашэсця.

Так пачалося і шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва, грозны рахунак знішчаных гітлераўцаў.

## ШКОЛА СМАЛЯЧКОВА

Смалячкоў не толькі сам умела і бязлітасна знішчаў фашысцкае звяр'ё, але паспяхова навучаў снайперскаму майстэрству маладых байцоў, перадаваў багаты, набыты ў баях вопыт сваім таварышам.

Прабіраючыся на «паляванне» і вяртаючыся назад, Смалячкоў у простай прыяцельскай гутарцы, як-бы між іншым, знаёміў напарніка з усімі тонкасцямі прафесіі знішчальніка. На агнявой пазіцыі даваў Федзя наглядныя ўрокі снайперскага майстэрства і ваеннай хітрасці.

...Над варожым акопам паказалася аднойчы галава немца.

— Страляй! перадае напарнік—наглядальнік Шушкін. Але Смалячкоў не страляе. Ён уважліва ўглядаецца ў рухі фашыста. Яны паказаліся снайперу дзіўнымі, ненатуральнымі. Так і ёсць. Гэта пугала!

У кісель воцату не льюць,—гаворыць Смалячкоў напарніку кухарскай прыказкай. — Нас не правядзеш!

І Смалячкоў чакае. Немцы патрымалі пугала некалькі хвілін і, выпрашыўшы, што паблізу нікога няма, пачалі самі выпаўзаць з-за ўкрыцця. Смалячкоў спакойна наглядаў за паводзінамі немцаў. Яны, не спяшаючыся, устанаўлівалі кулямёт, рыхтаваліся да абстрэлу савецкіх пазіцый. Смалячкоў скрытна заняў больш зручную пазіцыю і адкрыў агонь. Аднаго за другім ён уклаў на месцы ўвесь кулямётны разлік, а пасля бронебойнымі кулямі расстраляў і кулямёт.

Шушкін добра засвоіў усе гэтыя прадметныя ўрокі свайго настаўніка Хвядоса Смалячкова і неўзабаве сам стаў самастойным снайперам, адкрыў уласны рахунак знішчэння фрыцаў. А Смалячкоў таксама клапатліва і метадычна стаў вучыць ужо наступнага свайго напарніка. Вяртаючыся з «Палявання» у зямлянку, Федзя падоўгу гутарыў з байцамі, расказваючы аб праведзеным у засадзе дні, знаёміў з тонкасцямі снайперскай справы. Ён заўсёды сцвярджаў, што кожны баец можа стаць снайперам, грозным знішчальнікам фашысцкіх бандытаў.

— Сакрэт тут невялікі, — гаварыў Смалячкоў,—галоўнае — цярпенне. І немцаў баяцца не трэба. Не так страшны чорт, як яго малююць. Падкраўся, высачыў—і шчоўк!.. Вось лішняга стрэлу не смей рабіць! Біць толькі напэўна. На авось—у снайперскай справе не

гадзіцца, таму што і немца не заб'еш і сябе выявіш...

Байцы слухалі гэтыя простыя, бясхітрасныя апавяданні і ў кожнага з іх з'яўлялася ўпэўненасць у свае сілы, распальвалася жаданне авалодаць грознай прафесіяй знішчальніка фашыстаў. А Смалячкоў умела і метадычна перадаваў ім свой багаты, набыты ў баях вопыт.

— Важна рубеж добры падшукаць. І кожны дзень трэба новы выбіраць такі, каб ніякаму гансу і ў галаву не прышло, што там снайпер сядзіць. І запасны рубеж трэба падрыхтаваць, каб было куды адыйсці, пазіцыю перамяніць, калі ў адным месцы выявяць.

А яшчэ трэба ўмець немцаў, як рыбку на чарвячка, у пастку лавіць. Я, калі ўбачу групу немцаў, першага на смерць не б'ю, а толькі параню. Ён крык уздыме, пішчаць пачне. На падмогу да яго пачнуць другія фашысты паўзці. Вось тут я іх паадназму і шчоўкаю.

Гэтыя простыя парады байцы слухалі з вялікай увагай, успрыймаючы іх, як непахісныя законы снайперскага майстэрства, якія перадавалі багаты вопыт іх любімага таварыша і настаўніка.

Таксама проста і зразумела апавядаў Смалячкоў аб майстэрстве маскіроўкі, аптычным прыборы, як выяўляць сілу ветру і як лепш на якую адлегласць цэліцца. Не абмяжоўваючыся такой тэарэтычнай вучобай, Смалячкоў выводзіў сваіх вучняў на агнявы рубеж і там

пад агнём праціўніка, на жывых мішэнях, даваў наглядныя ўрокі снайперскага майстэрства.

Так нарадзілася ў баях школа Смалячкова. Слава аб ёй пайшла ад часці да часці, па ўсяму фронту. З кожным днём з'яўлялася ўсё больш і больш яго вучняў і паслядоўцаў. Ужо ў першыя тры месяцы яны знішчылі звыш 3 тысяч гітлераўцаў. Смалячкоў радаваўся поспехам сваіх вучняў, усякім чынам дапамагаў ім, асабістым прыкладам заклікаў іх на новыя і новыя подвігі ў імя радзімы.

## ПРЫКЛАД ВА ЎСІМ

Славу, гавораць, не заманіш, за грошы не купіш; слава прыходзіць сама. Сама яна прыйшла і да Федзі Смалячкова. Ён не думаў аб славе, не чакаў яе і нават не прыкмячаў, адкуль, якімі сцежкамі яна прыйшла.

Але яна расла з кожным днём. Аб ім гаварылі байцы ў зямлянках, пісалі ў газетах. Ленінградцы прысылалі яму падарункі, лісты, пажаданні яшчэ больш знішчаць фашысцкіх забойцаў.

Слава не ўскружыла галаву Смалячкову. Ён заўсёды быў і застаўся скромным, простым совецкім чалавекам, які думаў толькі аб славе сваёй радзімы, аб поўным і канчатковым разгроме яе заклятых ворагаў.

...У дывізіі праходзіў злёт снайпераў; пад шумныя апладысменты сваіх вучняў і баявых

таварышоў на трыбуну ўзышоў Хвядос Смалячкоў. Ён нават не думаў, што гэта яго так ўрачыста сустракаюць байцы і камандзіры. Ён разгублена аглядаўся па баках, жадаючы ўбачыць, каго-ж так урачыста сустракае зал. Доўга не мог Федзя пачаць сваю прамову.

— Ну, што-ж вы, таварыш Смалячкоў, маўчыце,—звярнуўся да яго генерал-маёр, калі ў зале наступіла мёртвая цішыня,—раскажыце, як вы знішчаеце фашыстаў.

— Што-ж мне сказаць? Ну, што тут такога? Выходжу на пярэдні край метраў за сто ад фашыстаў, часам і бліжэй падпаўзаю... Выследжваю гадзюк і—забіваю...

А ў асяроддзі таварышоў Смалячкоў гаварыў, і гаварыў гэта шчыра, без фальшывай скромнасці і рысоўкі:

Ну, што я такое зрабіў? Вось лётчыкі—дык тыя героі, а я нічога асаблівага.

І Смалячкоў шчыра лічыў, што ён нічога асаблівага не зрабіў, ён проста змагаўся з ворагам, як належыць воіну Чырвонай Арміі, патрыёту вялікай Краіны Советаў. Усе пахвальбы, узнагароды ён прымаў як аванс на будучае, і, не шкадуючы энергіі, сіл і нават уласнага жыцця, стараўся аплаціць гэта новымі подвігамі, новымі дзесяткамі і сотнямі знішчаных фашысцкіх бандытаў.

Федзя Смалячкоў заўсёды быў і застаўся верным і шчырым баявым таварышам. Ён ніколі не пакідаў у цяжкім становішчы сваіх

таварышоў, і заўсёды гатоў быў, рызыкуючы ўласным жыццём, прыйсці на дапамогу таварышу.

Байцы і камандзіры, якія блізка ведалі Смалячкова, горача любілі яго за яго скромнасць, мужнасць, прастату. Яны ва ўсім бралі з яго прыклад, вучыліся ў яго не толькі снайперскаму майстэрству, але і скромнасці, настойлівасці ў дасягненні мэты, бязмежнай адданасці радзіме, вучыліся ўсяму, што так упрыгожвае совецкага чалавека.

## БЯССМЕРЦЕ

На баявым рахунку Смалячкова быў ужо сто дваццаць адзін знішчаны гітлеравец, калі ён у апошні раз вышаў на «паляванне». Быў люты мароз, аж дух захапляла. Срабрысты іней пакрываў бровы, толькі прарэзваўся пушок барады і вусоў юнага байца. Схаваўшыся ў глыбокай варонцы, Смалячкоў, як заўсёды, цярпліва чакаў, пільна ўглядаючыся ў варожы стан. Доўга ніхто не з'яўляўся. Сонца набліжалася ўжо да вяршыні кароткай зімою дугі, калі ў варожых акопах Федзя прыкмеціў рух. Група немцаў перасоўвалася ў траншэях. Ён яшчэ шчыльней прыхінуўся да прыклада вінтоўкі і спакойна спусціў курок. Пачуўся сухі стрэл. За ім другі, трэці. Яшчэ трыма гітлераўскімі бандытамі стала менш на совецкай зямлі.

Сто дваццаць пяць гітлераўцаў пала ад мет-

кай кулі Хвядоса Смалячкова. Чатыры кулямёты расстраляў ён бронебойнымі кулямі; некалькі дзесяткаў гітлераўцаў знішчыў гранатамі і ў агульных атаках.

На гэтым яго баявы рахунак абарваўся. Варожая куля абпаліла скроню Хвядоса Смалячкова. Фашысцкія снайперы (а іх дзесяткі палявалі за нязлоўным совецкім звышметкім стралком) выявілі Смалячкова, абарвалі яго слаўнае жыццё, якое толькі яшчэ пачыналася. На дзевятнаццатым годзе свайго юнага жыцця Смалячкоў загінуў на баявым пасту.

Яго баявая падруга—вінтоўка № 13914 перайшла ў рукі яго лепшага вучня, выдатнага снайпера, старшага сержанта комсамольца Сталярова.

Ён, дзесяткі другіх вучняў Смалячкова, многія тысячы яго паслядоўцаў і баявых таварышоў пакляліся помсціць за смерць любімага настаўніка і друга.

Над целам бясстрашнага героя яны далі клятву помсціць злобнаму ворагу, пакуль апошні гітлеравец не падзе мёртвым ад справядлівай караючай рукі совецкага воіна.

На дзевятнаццатым годзе абарвалася жыццё Хвядоса Смалячкова, якое ён без астачы аддаў за любімы горад Леніна, за родную Беларусь. І гэтым ён увайшоў у бяссмерце. Імя яго ніколі не забудзе совецкі народ, за шчасце якога ён так мужна і ўмела змагаўся. Слава аб ім не згасне ніколі.

Над магілай героя байцы склалі аб ім быліну. Як баявую клятву перадаюць яе з вуснаў у вусны байцы Ленінградскага фронта; ім утороць бясстрашныя беларускія партызаны. Вось яна, народжаная ў баях быліна:

Затуманилось солнце красное,
В снежной изморози взошло.
Горе тяжкое... в чистом полюшке
Молодой богатырь погиб.
Феодосий, по отцу Артемьевич,
Смолячков, молодой стрелок,
Среди самых бесстрашных числился
И геройскую принял смерть.
Феодосий бил всегда без промаха,
Но не белок и не куниц,
Бил поганые вражьи головы
Сто и с четвертью уложил,
Что же ты, ветер, дозоры не выставил,
Что же ты, месяц, не посветил,
Что же ты, мать-земля, не раздвинулась,
Чтобы храброго уберечь.
Отвечал ветер красну-солнышку:
— Смолячкова я знал, берег,
Отводил пули вражьи в стороны
И следы заметал снежком...
Отвечал солнцу месяц сумрачно:
— Я светил ему в небе звёздами
Падал на земь косым лучом...
Но не ночью, а в утро хмурое
Молодой богатырь погиб.
И сказала мать-земля солнышку:
«Понапрасну винишь ты нас—
Я сугробы заслоном ставила,
И ставала кустом в пути.
Но не вышло ты в утро хмурое,
Не блеснуло на вражью сталь,
Не увидел он зверя лютого,

Не заметил проклятых глаз...
Еще горше тут стало солнышку,
Пуще прежнего пал туман...
Вдруг с земли прозвучали выстрелы
И послышалась чья-то речь.
Пораздвинуло солнце изморозь,
Поглядело, а там внизу—
Смолячкова лежат товарищи,
Не один их, не сто, а тысяча,
А, быть может, и две и три
Молодых боевых товарищей,
Все с винтовками возле себя:
— Мы, как ты, будем меткою пулею
Без пощады разить врага,
Истреблять их по сто, не менее,
Целить прямо в проклятый глаз.
Мы клянемся, как ты, быть стойкими,
Защищая отчизну свою,
Сдержим слово свое комсомольское,
Истребленною черною нечистью
Обессмертим имя твое.
И на солнце сверкнув оружием,
Сжав винтовки покрепче в руке,
Поклялись мстить за друга тысячи
За героя богатыря.

Гэтую быліну, гэтую клятву паўтараюць байцы і партызаны. З ёй яны ідуць у бой і няшчадна б'юць заклятага ворага, з ёй яны даб'юцца канчатковай перамогі над ворагам.

Заваяваная ў баях перамога і будзе лепшым помнікам народнаму волату, бясстрашнаму сыну беларускага народа Хвядосу Арцёмавічу Смалячкову.

★

Рэдактар **І. ГУРСКІ**

Падпісана да друку 15/IX 1943 г. 1 друк. аркуш.
А 2730 Тыраж 30000. Заказ 2327.

Друкарня «Известий». Масква.

Цана 60 кап.